

# Беларускія ручнікі

Выканала Сойко Поліна

# Гістарычныя звесткі

Ручнік — маркіраваная арнаментам, колерам і іншымі сродкамі выразнасці даматканая тканіна, якая выконвае важныя рытуальна-сімвалічныя функцыі ў абрадах; кавалак палатна для ўтылітарнага выкарыстання. Прадмет народнай культуры і творчасці ўсходніх славян. Ручнікоў патрабавалася шмат, бо традыцыя прадугледжвала выкарыстанне іх амаль ва ўсіх значных абрадах і звычаях. Шматаблічны, зменлівы ручнік ператвараўся то ў вясельны падножнік, то ў аброчную тканіну, то ў магічную рэч, здольную адхіліць ліха і смерць.



# Па прызначэнні ручнікі бываюць:

гігіенічна-бытавыя (утылітарна-бытавыя, штодзѐнныя);

дэкаратыўна-абрадавыя (радзінна-хрэсьбінныя, вясельныя, пахавальныя);

У залежнасці ад прызначэння і функцыі ручнікі маюць розныя назвы. Ручнікі ўтылітарныя паўсюдна на Беларусі называюцца “ўціральнік”, “уцірач”, —уцірка”, а таксама — “трапкач”, “скарач”, “брэндзал”, патрэпнічак,“надзѐжнік”. Яны ўжываліся для выцірання рук, твару пасля

ўмывання; выцірання посуду; у іх пераносілі керамічныя палявыя гаршкі з ежай у поле, ці на сенажаць. Абрадавыя — “набожнік”, “ручнік”, “намітка”, “падарак”,

“падножнік”.

Суаднесенасць гэтай рэчы з абразамі, з чырвоным кутом адлюстравана ў

лакальных назвах: “набразнік”, “абразны ручнік”, “накутнік”, “багавік”,

“завеска”, “плат”, “платок”, “набожны платок”. Найбольш сціплыя па дэкору прызначаліся для штодзѐннага побыту і надавалі будзѐнны выгляд хаце.

Святочныя набожнікі – абавязкова выконваліся з перавагай чырвонага колеру.







# Ручнікі як твор народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва



Функцыянальнасць мясцовых ручнікоў:

набожнікі, уціральнікі, падножнікі, вясельныя ручнікі, для перавязвання сватоў.

Матэрыял тканіны:

лѐн; бавоўна; лѐн + бавоўна (аснова, уток); куплѐная тканіна (паркаль,

разрэджаная тканіна тыпу канвы).




Матэрыялы дэкору і іх колер:

чырвоныя бавалняныя ніткі (горынь, забалаць, запалач);

чорныя і сінія ніткі;

белыя бавалняныя ніткі (бель);

рознакаляровыя ніткі (мулінэ, акрыл).

# Вобразы Сонца і Зямлі

Нашы продкі-славяне лічылі, што галоўнымі багамі сярод людзей і ў прыродзе з'яўляюцца светлае Сонца і Маці-Зямля-Карміцелька. Ад іх пайшло ўсѐ жыццѐ на зямлі. Бог Сонца і Маці-Зямля даюць

людзям усѐ: хлеб і ваду, цяпло і святло, рэчкі і азѐры, палі і лясы. Іх дзеці –

Ярыла і Жытняя Баба – глядзяць за ўродам жыта і пшаніцы. У Ярылы і Жытняй

Бабы былі свае дзеці – ураджай Жыцень, ураджай Спарыш, ураджай Рай,

ураджай Багач. Яны глядзелі, каб на ніве быў урод, каб жытні колас быў цяжкі,

каласісты, каб уся ніва была застаўлена снапамі ды бабкамі, каб сталы ламіліся ад хлеба-караваю.

У старыя часы да Сонца як да бога звярталіся па дапамогу.

| | |
|---|---|
|  | Вобраз Сонца мае выгляд ромба з праменямі ў бакі. Запаўненне ромба мае розныя варыянты |
|  | Вобраз Зямлі-Карміцелькі набыў выгляд ромба, запоўненнага маленькімі квадрацікамі ці ромбікамі. Гэта нібы зярняткі, роўна засеяныя на полі дбайнай рукой селяніна. |




Вобраз Маці–Радзіцельніцы характэрны для мастацтва сяго свету, але ў беларусаў карыстаецца асаблівай любоўю. Магчыма таму, што працавіты, міралюбівы беларускі народ, які ніколі ні на каго не нападаў, сам не раз цярпеў ад варожых нашэсцяў, якія неслі на беларускую зямлю спусташэнні і смерць. Ратавала народ ад канчатковай пагібелі толькі здольнасць жанчыны нараджаць. Таму і ўслаўлялі нашы продкі жанчыну-маці, упрыгожваючы яе стылізаваным сімвалам многія свае вырабы.

Калі Бог хоча благаславіць жанчыну, ѐн пасылае ѐй у дар дзіця. Таму ў старыя часы найбольш шанаванай, найбольш паважанай была багіня Маці-Радзіцельніца. Яна нарадзіла і выхавала нас усіх, дала нам самае дарагое – жыццѐ.



Вобраз палѐў. Таксама натхняла рукадзельніц прыгажосць палѐў, якія залацяцца спелым жытам, і зялѐных, ці квецістых лугоў





Культ агню ў язычніцкіх славян быў пашыраны. Увогуле агонь, ачаг у нашай свядомасці звязваецца з домам, сям'èю. Вытокі гэтых вераванняў – у тых часах, калі чалавек упершыню навучыўся карыстацца сілай агню.

У славян агнѐм загадваў Жыжаль – блізкі сваяк антычнага грэчаскага бога агню і рамѐстваў Гефеста. ―Жыжаль – добры дзядзька. Ён усіх абдорыць: жанок – сярпамі, мужыкоў – лемяхамі, дзетак цяплом сагрэець. Выпаліць печы, каб старыя грэлі плечы‖.

У вышыўцы і ткацтве Жыжаль паказваецца багата распрацаваным матывам, у аснове якога – васьміканцовая разетка – зорка. Ад яе адыходзяць стылізаваныя ці досыць рэалістычныя раслінныя ўзоры.

Вобраз моцнай дзяржавы, крэпкай сям'і. Кожная цывілізаваная краіна заклапочана ўмацаваннем сям'і. Гэта той падмурак, на якім трымаецца дзяржава. Моцная сям'я – моцная дзяржава, аснова дабрабыту і шчасця



Вобраз кахання. Найбольш поўным выразнікам лірычных і паэтычных настрояў у народным мастацтве былі птушкі. Так, зязюля сімвалізавала жанчыну-ўдаву, салавей – песняра кахання, сокал – вобраз каханага, арол – героя.

Што датычыць голуба – ѐн сімвалізуе многія паняцці. Так, ѐн выступае як сімвал міру, у хрысціянстве абазначае Святога духа. Але часцей за ўсѐ ѐн сімвалізуе каханне.

Так, пачатак кахання, першае знаѐмства хлопца з дзяўчынай сімвалізуюць два галубы павернутыя галовамі ў адзін бок, якія ідуць адзін за адным.

Калі птушкі павернуты галовамі адна да адной, а асабліва калі паміж імі – букет кветак, – гэта сімвал кахання ў самым росквіце.

Калі ж птушкі павернуты галовамі Ў розныя бакі – на жаль, каханне скончылася. Гэта выява – паэма пра трагічнае каханне, каханне без узаемнасці.



Вобраз пеўня. Шчасце сям'і, сядзібы, хаты ахоўвалі абярэгі – сімвалы свяшчэнных жывёл і птушак. Сярод такіх вобразаў-абярэгаў вядучае месца займае певень. Крык пеўня асацыіруецца з наступленнем дня, узыходам сонца, знікненнем нячыстай сілы. Певень – як дамавік, ён аберагае селяніна, сцеражэ сямейнае шчасце.

Два пеўні, сіметрычна размешчаныя паабапал букета ці вазона, выступаюць у ролі абаронцаў, апякуноў жаночай долі.




Вобраз чалавека. Дзяржава складаецца з людзей. Чалавек – основа жыцця на зямлі, аснова сям'і, прадаўжэння роду, моцы дзяржавы. Сімвалам чалавека ў народнай свядомасці з'яўляецца зорка. ―Нарадзіўся чалавек – на небе з'явілася яго зорка. Добры чалавек – яго зорка гарыць яркаǁ, – кажуць людзі. Зорка таксама сімвал славы, росквіту творчых сіл. Кажуць: ―Зорка першай вялічыні, закацілася яго зоркаǁ.



Вобраз роднай Беларусі перадаецца ў выглядзе разеткі, аблямаванай гірляндай кветак. Вышываючы гэты ўзор, майстрыха гаворыць аб сваѐй любові да Радзімы, прапануе, каб людзі захапляліся Беларуссю і яшчэ больш шанавалі яе. Для многіх вышывальшчыц любоў да сваѐй Бацькаўшчыны звязваецца з любоўю да нечага канкрэтнага, што яны бачаць штодзѐнна – магутнага лесу і дуброў, блакітных рэк і азѐр, маляўнічых лугоў і садоў, прасторных палѐў і ніў.



Вобраз песні. Калі дзяўчаты вышывалі ўзоры, яны спявалі песні. Асабліва падабаліся ім песні аб каханні. Песні і ўзоры суправаджалі беларускую сялянку напрацягу ўсяго жыцця. Гэта як самыя блізлія сябры, яе мары і спадзяванні. Розныя па настроі песні выклікалі нараджэнні розных узораў.






Вобраз крыніцы. У старыя часы, калі нашы продкі яшчэ не ўмелі капаць калодзежы, чыстую ваду яны бралі з крыніц. Гэта было святое месца. Крынічная вада лічылася карыснай, гаючай, чароўнай. У крыніцах такая вада, казалі ў народзе, што калі чалавек яе нап’ецца, будзе дужы ды здаровы. Таму крыніца – гэта сімвал жыццѐвай сілы, моцы, здароўя, сімвал духоўнасці, яднання з роднай Зямлѐй

Вобраз дрэва. Жыццѐ нашых продкаў было цесна звязана з лесам. Ён даваў дрэва на будаўніцтва і розныя вырабы, карміў грыбамі і ягадамі, ачышчаў паветра, насычаў яго кіслародам. Таму ў народнай творчасці так часта прысутнічае вобраз дрэва: магутнага волата-дуба, пяшчотнай дзяўчыны-бярозы, гаротнай сіраты-каліны, прыгожай ўдавіцы-рабіны, удалога малайца-клѐна.

# Заключэнне

Ручнік – адзін з найбольш цікавых фенаменаў традыцыйнай культуры беларусаў.

Ён суправаджаў чалавека на працягу ўсяго жыцця. Штодзѐнна, змываючы сон, чалавек «ласкаў» твар ручнікам-уціральникам. Сядаючы за стол, сям’я, творачы малітву, глядзела ў чырвоны кут, у якім Святы Вобраз знаходзіўся ў абрамленні ручнікоў. Збіраўся чалавек у дарогу ці ў госці, абавязкова браў з сабою ручнік, з ім жа перад хатаю сустракаў дарагіх гасцей. На тонкі, мяккі ручнік бабка-павітуха прымала навароджанае дзіця. З ручнікам ішлі сватацца.

Самую дарагую сямейную святыню – ікону, дазвалялася выносіць з дому толькі



м, што ручнік з’яўляецца сімвалам

ік беларусаў.